# *Завяршым адраджэнне бібліятэкі*

Восенню 1946 года споўніцца дваццаць пяць год існавання Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імені В. І. Леніна. Перад Айчыннай вайной Дзяржаўная бібліятэка мела двухмільённы кніжны фонд. Нямецка-фашысцкія захопнікі па-зарварску разграбілі бібліятэку.

Зараз бібліятэка зноў адраджаецца. У 1946 годзе яна павінна завяршыць аднаўленне свайго кніжнага фонда.

Вялікая работа зараз праводзіцца бібліятэкай па апрацоўцы і падрыхтоўцы да выкарыстання звыш аднаго мільёна звернутых кніг. Гэтая работа разлічана і на 1946 год. У бліжэйшы час будзе разгорнута ў поўным аб'ёме работа ўсіх аддзелаў, чытален, кабінетаў па абслугоўванню чытача.

Таксама прадстаіць аднаўленне работы Дзяржаўнай бібліятэкі ў якасці бібліяграфічнага інстытута БССР. Для гэтай мэты будуць адноўлены зборы бібліяграфічных матэрыялаў, у тым ліку асноўная картатэка па беларускай бібліяграфіі. Будзе таксама адноўлена выданне летапісу друку БССР і закончаны для друкавання буйныя навукова-бібліяграфічныя работы.

**І. СІМАНОЎСКІ,**

**дырэктар Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імені Леніна.**